Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

Літаратура і мастацтва

№ 5 (5363) 6 лютага 2026 г.

ISSN 0024-4686

# НЕ ПРОСТА ДЗЕЦІ — АСОБЫ

***Спецыяльныя фонды Прэзідэнта на працягу трыццаці гадоў падтрымліваюць таленавітую моладзь***



Фота БелТА.

Талент – гэта магутны імпульс, які дазваляе дасягаць высокага ўзроўню ў нейкай справе. Своечасова яго заўважыць – значыць, даць магчымасць раскрыцца, развіваць і ўдасканальваць здольнасці, каб дзіця магло шырока пра іх заявіць. У нашай краіне існуе адмысловая сістэма падтрымкі юных талентаў на розных узроўнях: ад сада і школы да спецыяльных навучальных устаноў, у прыватнасці, у галіне мастацтва і культуры. Дзяржава паказвае, што здольныя і таленавітыя людзі ёй патрэбны, дзеля гэтага ў 1996 годзе быў створаны спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Пра тое, што далі 30 гадоў яго існавання, была магчымасць паразважаць падчас урачыстага канцэрта «Таленты Беларусі – будучыня краіны», відовішчнага і іскрыстага. Але што насамрэч за гэтым стаіць?

ISSN 0024-4686

Заканчэнне на стар. 2-3 ►

# Не проста дзеці — асобы




## Фактычна

Лічбы ўражваюць: праз фонд атрымалі дапамогу больш за 4600 маладых людзей і 385 творчых калектываў. Фонд размяркоўвае гранты, стыпендыі, заахвочванні – гэта матэрыяльная частка. Але ёсць іншы бок падтрымкі, не менш істотны для носьбітаў талентаў: арганізацыя выступленняў, канцэртаў, выставак, што дазваляе ўжо з ранніх гадоў адчуваць сувязь з гледачом і слухачом, адзначаць рэакцыю, радавацца, што ёсць увага да таго, што робіш. Таму што нават самы яскравы ад прыроды талент можа згаснуць без увагі і развіцця. А пры правільнай падтрымцы нават самыя сціплыя здольнасці могуць раскрыцца дзіўным чынам.

Таму маленькаму ці юнаму чалавеку часам вельмі патрэбна разумець, што ён нездарма ідзе пэўным шляхам. І гэта не проста пафасныя словы, бо каб стаць добрым мастаком, музыкантам, танцоўшчыкам, артыстам, спеваком даводзіцца ахвяраваць добрай часткай дзяцінства: замест вуліцы, гульняў і іншых радасцей лішні раз займацца, практыкавацца. Што такія дзеці ёсць у лічбавую эпоху з яе спакусамі – само па сабе дзіва. А яны ёсць. І якая ж радасць для іх адчуваць сябе зоркамі ў вачах дарослых і ўпэўнівацца, што ўсё нездарма.

Напрыклад, у юнай спявачкі Амаліі Сухан была магчымасць сябе паказаць – і нават перамагчы! – на сур'ёзным міжнародным дзіцячым музычным конкурсе «Віцебск-2025». Яна з'яўляецца лаўрэатам спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі. І дзяўчынка не расслабляецца, працуе… Таленавітыя дзеці вельмі рана пачынаюць разумець, што поспеху не бывае без намаганняў. У некаторых кірунках мастацтва менавіта яны – аснова развіцця. Варта паглядзець хоць адно выступленне мазыраніна Арсенія Арцюшкі, які заваражвае сваімі трукамі ўсіх у зале. Юны выхаванец заслужанага аматарскага калектыву, узорнай студыі цыркавога мастацтва «Арэна» ўмее трымаць раўнавагу, дарэчы, не толькі на сцэне. Спакойны і разважлівы і ў жыцці, ён распавёў, як атрымаў заахвочвальную прэмію спецыяльнага фонду: для маленькага горада, вядома, гэта была падзея. Увага, публікацыі ў мясцовай газеце, запрашэнні ўзяць удзел у розных імпрэзах.

– Асабіста для мяне такая адзнака стала матывацыяй, каб развівацца ў гэтым кірунку, удасканальваць свае навыкі і далей радаваць гледачоў сваімі нумарамі, – гаворыць Арсеній Арцюшка і ўдакладняе: – Матэрыяльная падтрымка – гэта прыемны бонус, што дазволіў акупіць некаторыя выдаткі, неабходныя для выступленняў. Вядома, артыст заўсёды клапоціцца пра перспектыву.

## Практычна

Дарослыя, якія самі былі дзецьмі, ведаюць: любая будучыня гартуецца сёння. Таму падтрымка маладых талентаў – свайго роду інвестыцыя ў будучыню. Прычым дзяржава клапоціцца пра забяспечанасць кадрамі ў тых кірунках, дзе кожны – не проста спецыяліст, а ўнікальны, непадобны да іншых. Дзяржаве патрэбны творчыя/крэатыўныя людзі, бо яны, як ні дзіўна, уплываюць на эканамічны рост: крэатыўныя індустрыі і мастацкія праекты акрамя таго, што даюць прыбытак у бюджэт, спрыяюць нараджэнню новых ідэй у грамадстве, рыхтуюць свядомасць людзей для больш простага ўкаранення інавацый у любых галінах дзейнасці, развіваючы небанальнае мысленне. А ёсць яшчэ адна істотная задача: захаванне і фарміраванне культурнай ідэнтычнасці, што актуальна для любой краіны, якая хоча заставацца на карце свету. Бо самае відавочнае і зразумелае абгрунтаванне незалежнасці – адметная нацыя з магутнымі традыцыямі і скіраванасцю на развіццё і росквіт. А найлепшае яго ўвасабленне – у самабытнай і цікавай сучаснай культуры.

Часта кажуць, што талент праб'ецца сам. Так бывае, хоць у самой фармулёўцы закладзены момант напружанняў і змаганняў, якія могуць аднясць сілы. Адна справа – прафесійныя конкурсы,



**Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.**

## *Віншаванне лаўрэатам спецфондаў Прэзідэнта па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў і падтрымцы таленавітай моладзі*

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў лаўрэатаў і стыпендыятаў спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў і падтрымцы таленавітай моладзі з 30-годдзем з дня стварэння фондаў.

«Вынікам шматгадовай дзейнасці фондаў стала мноства дасягненняў, значных праектаў і ініцыятыў. Лаўрэаты і стыпендыяты горда заяўляюць аб сабе, упарта і настойліва спасцігаюць вяршыні майстэрства, нястомна імкнуцца да новых адкрыццяў», – гаворыцца ў віншаванні.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што розум, талент і мэтанакіраванасць даюць магчымасць лаўрэатам і стыпендыятам спецыяльных фондаў уносіць значны ўклад у навуковае і культурнае развіццё краіны, стаць сапраўднымі прафесіяналамі сваёй справы, адданымі роднай Беларусі.

«Асаблівых слоў удзячнасці заслугоўваюць педагогі і настаўнікі, якія нястомнай працай, глыбінnай мудрасцю і вялікай цярплівасцю дапамагаюць запаліць маладыя сэрцы»», – падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў усім моцнага здароўя, шчасця, удачы і яркіх перамог.



**Міністр культуры Беларусі Руслан Чарнецкі:**

«Калі зорачка запалілася, нельга даць ёй патухнуць. Трэба ладзіць канцэрты, конкурсы, якія будуць стымуляваць удасканаленне майстэрства».

гэта сапраўды загартоўвае характар, пра што ведае Лера Бернатовіч, якая годна вытрымала канкурэнцыю на «Славянскім базары ў Віцебску». Але зусім іншае – перашкоды вонкавыя, якія адцягваюць ад творчасці. Сёння выкарыстоўваюцца механізмы, што дапамагаюць чалавеку адчуваць не толькі сваю выбранасць, але і адказнасць перад дзяржавай, якая спрыяе яго станаўленню і ператварэнню ў прафесіянала высокага ўзроўню. Як? Маецца на ўвазе не толькі фінансавая падтрымка праз грашовыя прэміі, стыпендыі і гранты, а нават клопат пра будучыню праз магчымасць атрымаць спецыяльную адукацыю ў найлепшых творчых навучальных установах, прайшоўшы адбор пры паступленні, садзейнічанне ў атрыманні студэнцкага інтэрната, першачарговае размеркаванне, ільготнае крэдытаванне жылля і іншыя прэферэнцыі, што маюцца для маладых спецыялістаў, якіх чакаюць у творчых установах, арганізацыях і калектывах краіны.

Скрыпач Нікан Мазаль, стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта, цяпер з'яўляецца артыстам Узорна-паказальнага аркестра Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь. Ён прызнаецца:

– Я атрымаў неверагодныя магчымасці ў сферы мастацтва. Напэўна, гэта быў галоўны трамплін, галоўная падтрымка для мяне як для маладога музыканта, каб выступаць больш, у тым ліку на вялікіх пляцоўках і адказных мерапрыемствах. Адчуваеш увагу да сябе з боку дзяржавы – і думаеш пра тое, каб дасягнуць новых вышынь. Падтрымка ёсць не толькі на словах, але і на справе. Гэта дае магчымасць удасканальвацца як музыканту, адчуваючы ўпэўненасць у заўтрашнім дні, каб заставацца запатрабаваным.

## Стратэгічна

...І яшчэ адна думка: каб таленавітыя маладыя не шукалі шчасця недзе далёка. Для краіны яны – творчы і інтэлектуальны патэнцыял, які можа памнажацца ў геаметрычнай прагрэсіі: таленавітыя людзі часта самі становяцца настаўнікамі. Народная артыстка Беларусі, оперная спявачка Настасся Масквіна – лаўрэат спецыяльнага фонду 2000 года, адна з галоўных зорных сапрана нашага Вялікага тэатра, цяпер выкладае ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Передае асновы майстэрства студэнтам Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў малады беларускі графік Фёдар Шурмялёў. Лабараторыя эстраднага танца Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў пад кіраўніцтвам Вольгі Наўроцкай – кузня кадраў сучаснай харэаграфіі, якая падрыхтавала некалькі артыстаў, адзначаных фондам. Шматразовы лаўрэат і стыпендыят, віртуозная цымбалістка Вераніка Прадзед загадвае кафедрай струнных народных інструментаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, нават падчас канцэрта яна паказала майстар-клас, выступіўшы дуэтам з навучэнкай дзіцячай школы мастацтваў № 2 Гомеля Юліяй Аляксейкавай.

Яшчэ адно зорнае імя – Уладзіслаў Плігаўка. Таксама шматразовы стыпендыят фонду. Яго называлі найлепшым баяністам свету, а ён застаецца ў Беларусі і не супраць сыграць дуэтам са студэнтам Фёдарам Чаранко – запомніце яшчэ адно імя. Іх даволі шмат, вартых увагі і ядомасці, сучасных, прыгожых. Як Ганна Паўленка, студэнтка Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, настолькі мэтанакіраваная асоба, што ўжо з'яўляецца лаўрэатам не аднаго міжнароднага конкурсу піяністаў.

– Вельмі прыемна было атрымліваць спецыяльную прэмію – гэта знак таго, што я раблю ўсё правільна, што трэба рухацца ў выбраным кірунку, – адзначае дзяўчына. – У такой вялікай зале, як Палац Рэспублікі, я іграла першы раз. Для мяне, як для маладой піяністкі, важна і карысна, як вітае публіка. Спадзяюся, што гэта яшчэ адзін крок у маёй будучай кар'еры. Цяпер я працую канцэртмайстрам у школе і ў Акадэміі музыкі. Але мне здаецца, што трэба яшчэ займацца, і займацца каб і далей мець магчымасць выступаць.

«Дзе нарадзіўся – там і спатрэбіўся» – вядомая формула ў дзеянні. Эстрадная спявачка Вікторыя Алешка ўжо заслужаная артыстка краіны. Адразу пазнае публіка і Рамана Козарава, які з'яўляецца мастацкім кіраўніком беларускага дзяржаўнага ансамбля «Песняры». Заслужаная артыстка Беларусі Вера Палякова-Макей – дырэктар Тэатра юнага гледача. Музыкант Максім Расоха стаў мастацкім кіраўніком Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі імя Міхаіла Фінберга. Гэта значыць, што сістэма працуе...

**Ларыса ЦІМОШЫК**
**Фота БелТА**





